# Сінанімічны паядынак



# Конкурс «Ветлівы хлопчык»

Ну й «ветлівы» хлопчык!
(Хто кемны – зважай!)
Заходзіць аднойчы
Бабулька ў трамвай.
Заходзіць бабулька,
А месца – няма.
Сказаць «уступіце»
Не можа сама.
А «ветлівы» хлопчык
Насупраць сядзіць
І пільна ў акно
Пазірае, глядзіць.

Прыкінуўся хлопчык
Нявінным такім,
Як быццам бабулькі
Не бачыць зусім.
І толькі нарэшце
Ля школы сваёй
Ён ветліва кажа
Бабульцы старой:
- Садзіся, бабулька,
Мне злазіць цяпер…
А быў жа той хлопчык,
На жаль, піянер.



1. **Знайдзіце ў вершы сінонімы.**
2. **Падбярыце і запішыце сінонімы да падкрэсленых слоў.**
3. **Падбярыце сінонім да слова «ветлівы», ужытым у вершы.**

# Конкурс «Хто хутчэй?»

Другу баліць – мне нялёгка.
Маме баліць – вельмі цяжка.
Сыну баліць – невыносна.
А Радзіме баліць –
Стыне сэрца ад болю.

Н.Загорская



**Запішыце сінонімы ў парадку ўзмацнення прыметы або дзеяння.**
**Дамінантнае слова падкрэсліце.**

# Конкурс «Будзь уважлівым»

**У дадзеных словах знайдзіце сінонімы, растлумачце іх значэнні.**



1. І раптам адтуль упаў мне ў вочы нясцерпны яркі сноп святла. Асляпіў.
2. Зноў ляціць угору святло майго ліхтарыка. І зноў адтуль, у адказ, меч святла.
3. Празрысты месяц стуль на поле празрысты, светлы сноп спусціў.

# Конкурс «Знайдзі пару»

**З другога слупка падбярыце адпаведны сінонім да слоў з першага слупка.**



| 1. | Праца | А. | Дружба |
|---|---|---|---|
| 2. | Пяшчотны | Б. | Упарта |
| 3. | Вярнуць | В. | Паведаміць |
| 4. | Аб'явіць | Г. | Аддаць |
| 5. | Спакой | Д. | Работа |
| 6. | Сяброўства | Е. | Доктар |
| 7. | Урач | Ё. | Гультай |
| 8. | Лянівец | Ж. | Загаловак |
| 9. | Сумна | З. | Мала |
| 10. | Настойліва | І. | Цішыня |
| 11. | Назва | К. | Сакрэт |
| 12. | Нямнога | Л. | Маркотна |
| 13. | Тайна | М. | Ласкавы |

# Конкурс «Выберы і растлумач»

**З прапанаваных сінонімаў выберыце тыя, якія больш падыходзяць па сэнсе, і растлумачце, чаму.**



1.Родныя мясціны, (хата, харомы, дом, палац), бацькі мае – усё ўспамінаецца з
 замілаваннем і шчымлівым болем.
2. (Мары, летуценні) занеслі мяне далёка ад дому.
3.Нездарма спрадвеку кажуць у народзе: (сварка, дыскусія, палеміка) не да ладу, (сварка, дыскеусія, палеміка) хату зводзіць.

# Конкурс «Сагрэй словам»

**Знайдзіце ў дадзеным урыўку сінонімы.**

Стогнуць пілы, скрыгочуць бульдозеры –
Наламана нямала дроў.
І чарсцвее душа ад карозіі
Безадказных, бяздумных слоў.
Іх не возьмеш назад, іх не вернеш.
Камяком боль у горле засох.
І ніколі не ўзыдзе зерне,
Што ўпала ў бясплодны пясок.



# Конкурс «Знайдзі і дапішы»

**З прапанаванага сказа выпішыце сінонімы,**
**Дапоўніце сінанімічныя рады сваімі словамі.**

Я часта дзівіўся, як можа мясціцца ў гэтым панурым і маўклівым чалавеку такая невычэрпная чуласць і пяшчота, што мяжуе бадай з мацярынствам.







# Конкурс «Бумеранг»

1. **Вярні сінонім да слоў:**

   Свежая газета, простая задача, моцная вяроўка, свежы ручнік, салодкі яблык.

2. **Замяні ўстарэлыя словы агульнаўжывальнымі:**

   Хутка скончыліся зімовыя вакацыі. Зноў трэба брацца за кнігі, даставаць атрамант. Затое будзе весела, а то сядзіш адзін як перст дома.

3. **Замяні іншамоўнае слова беларускім адпаведнікам:**

   Працяжнік патрэбна адрозніваць ад дэфіса.
   Арфаграфія знаёміць з правіламі напісання.
   Перад вачыма разгортваўся прыгожы пейзаж.



# Конкурс «Скарбонка народнай мудрасці»

**Да выдзеленых слоў падбярыце фразеалагізм-сінонім.**



Працаваць <u>старанна</u> – …

Былі <u>аднолькавыя</u> – …

<u>Дакучаць</u> каму-небудзь – …

# Конкурс «Хто болей»

**Да прапанаваных слоў падбярыце як мага больш сінонімаў**

1. Гультай, абібок…
2. Працавіты, старанны…



# Жадаем поспехаў у наступнай гульні!